Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

# АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ СУЧАСНАЙ НАВУКІ

Зборнік навуковых прац

Мінск 2016

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

94:[67+339]"18/19"

# М. ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ АБ РАЗВІЦЦІ ПРАМЫСЛОВАСЦІ І ГАНДЛЮ Ў БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

# M. DOVNAR-ZAPOLSKIY ABOUT THE DEVELOPMENT OF INDUSTRY AND TRADE IN BELARUS IN THE SECOND HALF OF XIX-THE BEGINNING OF THE XXth CENTURY

**П. А. Мацюш**

**P. Matsiush**

*У артыкуле разгледжаны погляды вядомага беларускага гісторыка, этнографа, эканаміста, заснавальніка нацыянальнай гістарыяграфіі М. Доўнар-Запольскага на праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, у прыватнасці развіцця прамысловасці і гандлю ў парэформенны перыяд у Беларусі*

*The article deals with the views of the famous Belarusian historian, ethnographer, economist, founder of the national historiography M. Dovnar-Zapolski on the problems of social-economic development, especially the development of industry and trade in postreform period in Belarus*

Да спадчыны вядомага беларускага гісторыка, этнографа, эканаміста, заснавальніка нацыянальнай гістарыяграфіі М. Доўнар-Запольскага належаць грунтоўныя працы па этнаграфіі, сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі, Раісіі, Літвы, Польшчы.

Разглядаючы праблему сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст., М. Доўнар-Запольскі дае разгорнутую характарыстыку прамысловасці і гандлю краю.

На думку аўтара, 1860-я гг., з'яўляючыся працягам прыгоннай эпохі, уяўлялі сабой вельмі нізкі ўзровень прамысловага развіцця. Так, у сваёй большасці гарадское і местачковае насельніцтва абслугоўвалася яшчэ рамеснікамі, якіх у 60-х гг. XIX ст. налічвалася каля 36 тыс. чалавек. Панавала рамяство на заказ, у тым ліку хатняе рамяство. Тое, што тагачасныя статыстычныя звесткі называлі фабрыкамі і заводамі, большай часткай былі толькі развітымі рамеснымі майстэрнямі, бо ў сярэднім на кожную фабрыку і завод прыходзілася ўсяго 5,7 рабочых (прыведзены даныя за 1866 г.) з сумай вытворчасці ў 4,8 тыс. рублёў. Сапраўдным фабрычным раёнам можна прызнаць толькі Гродзенскую губ., якая ахоплівала 36 % усіх працоўных, 41 % усёй вытворчасці і 30% усіх фабрычна-завадскіх прадпрыемстваў. Зрэшты, там было шмат дробных устаноў, бо ў сярэднім кожнае фабрычна-завадское прадпрыемства Гродзенскай губ. мела 6,8 фабрычна-завадскіх рабочых. Па даных пачатку 1970-х гг. можна было адкінуць усе дробныя ўстановы з лікам працоўных да 10, і тады ў Беларусі б налічвалася, без вінакурных заводаў усяго 156 фабрычна-завадскіх прадпрыемстваў з 9,4 тыс. рабочых з вытворчасцю ў 7 млн рублёў. Але палова ўсёй гэтай вытворчасці і рабочых прыходзілася на Гродзенскую губ. [1, с. 105–106].

Сутнасць развіцця беларускай прамысловасці па М. Доўнар-Запольскаму выяўлялася ў тым, што прадукцыйнасць вытворчасці расла хутчэй, чым



колькасць фабрык. У параўнанні 1866 і 1913 г. колькасць фабрычна-завадскіх прадпрыемстваў зменшылася ў два разы, але колькасць рабочых вырасла ў 3–3/4 разы, а сума вытворчасці ў 6,3 разы. Калі зыходзіць з росту ў сярэднім кожнага прадпрыемства, то 1913 да 1866 г. можна разглядаць у такіх суадносінах: сярэдняя колькасць рабочых вырасла ў 6,5 разоў і сума вытворчасці ў сярэднім на адну фабрыку вырасла ў 10,6 разоў.

Гэта быў вельмі значны рост. У 1908 г. колькасць рабочых Беларусі складала 2,2 % ад усіх расійскіх фабрык, а ў 1913 г. – ужо 3,5 % усіх рабочых. Беларускія фабрыкі складалі 10,6 % усіх фабрычна-завадскіх прадпрыемстваў Расійскай імперыі (без горных заводаў) у 1908 г. і ўжо 11 % – у 1913 г.

Хаця фабрычна-завадскія прадпрыемствы ўсё яшчэ насілі характар дробнай прамысловасці, назіраецца працэс яе ўзбуйнення. У 1902 г. толькі 17 % прамысловасці, па ліку працоўных, магло быць аднесена да разраду буйной прамысловасці, а ў 1913 г. – ужо 22,3 %.

Гэта сведчыла аб росце прамысловага патэнцыялу краю. Хаця прамысловасць Беларусі яшчэ не дасягнула буйных памераў, былі сфарміраваны асноўныя кірункі развіцця. Адчувалася адставанне ад усёй астатняй Расіі, калі браць яе ў цэлым, бо ўжо ў 1908 г. прадукцыйнасць расійскай прамысловасці на аднаго жыхара ў сярэднім складала 30 руб., а ў 3 беларускіх губернях – толькі 6 руб. Але ўжо ў 1913 г. гэтыя суадносіны некалькі змяніліся.

Беларуская прамысловасць спецыялізавалася галоўным чынам на перапрацоўцы прадуктаў мясцовай вытворчасці. Выключэнне ўяўляла тая частка апрацоўкі кудзелістых рэчываў, якая перапрацоўвала бавоўну і прывазную шэрсць, тытунёвыя фабрыкі і апрацоўка металаў. Але ў той жа час, калі тэмпы апрацоўкі кудзелістых рэчываў некалькі зніжаліся, апрацоўка металаў, хімічная вытворчасць (запалкі), папяровая прамысловасць давалі значны рост.

М. Доўнар-Запольскі адзначае істотныя змены, якія адбываліся на рынку на працягу 1860–1870-х гг. Вываз сыравіны, пры гэтым сыравіны грубай, лесу без пераапрацоўкі, лёну, пянькі характарызаваў экспарт Беларусі ў першыя пасляпрэформенныя дзесяцігоддзі. Імпарт складалі пераважна прадукты земляробства. Але даныя 1900 г. ужо паказваюць, што разам з грубым таварам з 262 млн пудоў лясных матэрыялаў адпраўлялася 1,3 млн пудоў прадуктаў харчавання, г. зн. малочных і мясных прадуктаў.

Але напярэдадні вайны ўжо адзначаецца змяненне ў формах беларускага экспарту. Колькасць экспартнага лёну за 10 гадоў павялічваецца на трэцюю частку. Расце продаж каровінага масла, яек, сыру, жывой і бітай птушкі, сабавіны на расійскі і замежны рынкі. Увоз коней перавышаў іх вываз.

З цягам часу вываз лясных прадуктаў у грубым, неапрацаванымі выглядзе паменшаўся, але рос экспарт перапрацаванага лесу. Жалезных вырабаў увазілася ў тры разы менш, чым жалеза і сталі. Такім чынам, ішла пераапрацоўка гэтай сыравіны на мясцовых заводах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паступова беларускія вырабы знаходзілі сабе рынак за межамі краіны. Вываз беларускіх вырабаў даваў магчымасць увозіць з іншых раёнаў па 15 аршын парkалю ў год на кожнага жыхара, па 8 фунтаў цукру, па 0,2 пуду газы.

Такім чынам, нацыянальны даход стаў хутка ўзрастаць. У гэтым сэнсе Беларусь не адставала ад іншых раёнаў Расіі. Увесь яе нацыянальны даход з 1900 па 1913 г. вырас амаль удвая, з 576 млн да 1 млрд. Важна адзначыць тое, што ў складовай частцы нацыянальнага даходу прыбытак ад прамысловасці меў станоўчую дынаміку, хаця прамысловасць і адставала ад сельскай гаспадаркі. Так, у 1900 г. сельская гаспадарка Беларусі давала 54 % усяго нацыянальнага даходу, а прамысловасць – толькі 15 %.

Да 1913 г. прамысловасць дала павелічэнне на 5,6 %, і ўдзел прамысловасці ў даходзе Беларусі стаў набліжацца да памеру ўдзелу ўсёй прамысловасці імперыі ў яе нацыянальным даходзе (24 %).

Усё гэта сведчыла аб тым, што пры беднасці глебы, беларусы зрабілі вялікія поспехі ва ўдасканаленні тэхнікі сельскай гаспадаркі. Па ўраджайнасці жыта Гродзенская губ. зрабіла найбольшыя поспехі ў параўнанні з іншымі губернямі Еўрапейскай Расіі, на 3 месцы знаходзілася Мінская губ., на 5 – Віленская губ. на 11 – Магілёўская губ. і толькі 2 губерні апынуліся ў сярэдзіне. Па развіцці і перапрацоўцы жывёлагадоўчых прадуктаў Беларусь першапачаткова вылучалася сярод іншых губерняў, па ўжыванні сельскагаспадарчых машын і прылад, нарэшце, пачынала нават раўняцца з усёй астатняй Расіяй у галіне прамысловасці [2, с. 162–170].

Гэта азначала не толькі абсалютны рост дабрабыту, але і ствярала перадумовы для размяшчэння на тэрыторыі Беларусі большай колькасці насельніцтва. Важна падкрэсліць тую акалічнасць, што калі прамысловасць пераходзіла ў рукі буйнога капіталу, што цалкам натуральна пры ўмовах буржуазнага ладу, то ў галіне сельскай гаспадаркі выступала сялянская маса, і можна сказаць, што амаль палова нацыянальнага даходу пры слабасці памешчыцкага гаспадаркі, была вынікам яе працы.

Такім чынам, на думку М. Доўнар-Запольскага, сутнасць эвалюцыі беларускай гаспадаркі пярэформенага перыяду заключалася ў паступовым пераадоленні пережыткаў феадалізму. Разглядаючы прамысловае развіццё Беларусі ў акрэслены перыяд, даследчык сцвярджае, што прамысловасць пачала развівацца позна, перш за ўсё па прычыне адсутнасці капіталаў. Аднак нават у гэтых умовах асобныя галіны прамысловасці мелі інтэнсіўнае развіццё.

### Літаратура

1. Довнар-Запольский, М. В. История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – 2-е изд. – Минск : Беларусь, 2005. – 680 с.

2. Довнар-Запольский, М. В. Народное хозяйство Беларуси, 1861–1914 гг. / М. В. Довнар-Запольский. – Минск : Госплан БССР, 1926. – 239 с.



УДК 94(476)

## ГЕАПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ ВА УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ Ў 1470–1530-я гг.

## GEOPOLITICAL PROCESSES IN EASTERN EUROPE IN 1470–1530th

І. В. Пугач,
М. М. Сакалоў, Ю. А. Цераховіч

I. Pugach,
M. Sakalow, Y. Tserahovich

*У дадзеным артыкуле разгледжаны асноўныя геапалітычныя працэсы, якія адбываліся ва Усходняй Еўропе ў 1470–1530-я гг. Для атрымання больш цэласнай і аб'ектыўнай карціны былі прааналізаваны працэсы, якія ў адзначаны перыяд, мелі месца ў заходнееўрапейскім рэгіёне. Былі вызначаны асноўныя вузлы міждзяржаўных супярэчнасцяў і канфліктаў у межах Еўропы, якія доўгі час вызначалі характар міжнародных адносін. На падставе праведзенага даследавання аўтары робяць і даказваюць выснову аб тым, што адзначаны перыяд з'яўляецца перыядам кардынальных геапалітычных змяненняў ва Усходняй Еўропе. Змест артыкула дае магчымасць больш грунтоўна і аб'ектыўна падысці да асэнсавання і тлумачэння не толькі тых геапалітычных працэсаў, якія мелі месца ў адзначаны перыяд, але і тых, якія будуць характэрны для наступных гістарычных эпох. Акрамя таго, у межах даследавання была вызначана агульная ступень распрацаванасці дадзенай тэмы ў айчыннай, польскай, савецкай і рускай гістарыяграфіях*

*This article reflects the basic geopolitical processes that took place in Eastern Europe in 1470–1530-ies. For more complete and objective picture were analyzed processes, which, in the mentioned period, took place in the Western Europe. Also were identified the main nodes of interstate contradictions and conflicts in Europe, which for a long time determined the nature of international relations. On the basis of this study authors make and argue a conclusion that the mentioned period is a period of dramatic geopolitical changes in Eastern Europe. The content of the article allows to implement more thorough and objective approach to understanding and interpreting not only the geopolitical processes that took place in the mentioned period, but also those that will characterize the subsequent eras. In addition, in this study it was determined by the total degree of elaboration of this theme in the Belorussian, Polish, Soviet and Russian historiography*

XV–XVI стст. у гісторыі Еўропы з'яўляюцца даволі важнымі і цікавымі з пункту гледжання гістарычнай навукі. Менавіта на гэты час прыпадае пачатак новай эпохі – Новага часу. У гэты перыяд адбываецца працэс карэннай змены светапогляду людзей, якія насялялі Еўропу. Перш за ўсё гэта выявілася ў тым, што з пачаткам эпохі Адраджэння паступова адбываецца адыход ад схаластычна-рэлігійнага погляду на жыццё, на змену якому прыходзіць гуманістычна-рацыяналістычны. Гэтыя змены знаходзяць сваё адлюстраванне ў агульнапалітычнай кан'юнктуры Еўропы: пад уплывам гэтых зрухаў нацыянальныя ідэі пачынаюць узвышацца над рэлігійна-ўнівер-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ